[5] Вукашын — кароль заходняй Македоніі з сям'і герцагавінскіх феадалаў, якія былі пры сіле пры цары Стэфане-Душане (сярэдзіна XIV ст.), бацька Кралевіча Марка.

[6] Марка знаходзіцца ў войску султана і карыстаецца яго міласцю, таму можа выпрасіць у яго для сваіх сяброў маёнткі («агалуцы»).

[7] Прылеп — горад у Македоніі. Сталіца Кралевіча Марка, дзе ён нарадзіўся каля 1355 года. Цяперашні горад Прылеп знаходзіцца не на тым месцы, дзе стаяў сярэднявечны горад. У сяле Маркава-варош (Маркаў-град) знаходзяцца руіны манастыра св. Архангела, пабудаванага Вукашыным і Маркам, і замка Марка. У XIV стагоддзі Прылеп быў багатым горадам, праз які ішла дарога на Дуброўнік. З 1394 года — у турэцкіх руках.

[8] Паотчым. Марка называе султана сваім прыёмным бацькам.

## Падбрахач

[1] Малойца, зух

## Пане Каханку

[1] Караль Станіслаў Радзівіл «Пане Каханку» (27. 02. 1734, Нясвіж — 21.11 1790, Бяла-Падляска). Нарадзіўся ў сям'і гетмана Міхала «Рыбанькі» і Францішкі Уршулі Вішнявецкай. Вядомы пад прозвішчам «Пане Каханку», як яго называлі паводле любімага выслоўя, з якім ён звяртаўся да ўсіх, не выключаючы і пагарджанага караля — «худапахолка», а таксама дзеля адрознення ад канцлера Караля Станіслава Радзівіла (1669—1719). З 1752 г. — мечнік вялікі літоўскі Вялікага Княства Літоўскага, у 1762 г. стаў ваяводам віленскім. Выступаў супраць партыі Чартарыйскіх. На чале сваіх надворных войскаў уступіў у бітву з рускімі пад Слонімам, але пацярпеў паражэнне і вымушаны быў ратавацца на Валошчыне. Падчас знаходжання ў Дрэздэне да яго прыйшла вестка пра адабранне ў яго чыну ваяводы і сэквестравання яго маёнткаў. Дзякуючы намаганням расійскага пасла Мікалая Рапніна вярнуўся ў краіну і стаў у 1767 генеральным маршалкам Радамскай канфедэрацыі. Выказаўшы прысягу на вернасць каралю Станіславу Аўгусту Панятоўскаму, атрымаў назад усе страчаныя ўладанні. У 1768 г. выступіў праціўнікам гарантыйнага трактата, паводле якога Рэч Паспалітая станавілася расійскім пратэктаратам, і стаў генеральным маршалкам Барскай канфедэрацыі. Калі расійскія войскі з баямі ўзялі Нясвіж і Слуцк, Радзівіл быў вымушаны з'ехаць у Прусію. Да 1777 г. ён знаходзіўся на эміграцыі ў Венгрыі, Турцыі, Чэхіі, Францыі, Венецыі. Падчас Чатырохгадовага Сойму быў адным з выразнейшых праціўнікаў рэформ, караля і партыі Чартарыйскіх. З жніўня 1757 г. узнагароджаны ордэнам Белага Арла. Быў жанаты з Марыяй Каралінай Любамірскай, пасля з Тарэзай Каралінай Ржэўскай. Караль Станіслаў Радзівіл быў самым заможным магнатам Рэчы Паспалітай другой паловы XVIII стагоддзя і адным з найбагацейшых прадстаўнікоў арыстакратыі ў Еўропе. Яго ўладанні ахаплівалі 16 гарадоў і 683 вёскі, а вакол ягонай асобы было шмат легенд. З аднаго боку Караль Станіслаў быў прадстаўлены як адзін з найбольшых п'яніц і гуляк той эпохі, а з другога — быў прыкладам шляхетнасці, самарытанства і патрыятызму. Невымерна багаты і ўплывовы, здабыў сабе сярод шляхты вялікую папулярнасць

дзякуючы шчодрасці, сармацкім звычаям, схільнасці да бясед і жартаў, з іншага боку быў вядомы дзікімі выбрыкамі і раздражняльнасцю.

[2] Гэтая гісторыя змешчана ў кнізе Рудольфа Эрыха Распе «Дзівосныя падарожжы на сушы і на моры, ваенныя паходы і вясёлыя прыгоды Барона фон Мюнхаузена, якія ён звычайна распавядае за бутэлькай сярод сваіх сяброў». Першае выданне гэтых аповедаў з'явілася ў 1781 годзе на старонках часопіса «Даведнік для вясёлых людзей», які выдаваўся ў Берліне. Барон Мюнхаузен (1720—1797), «кароль ілгуноў» — фігура гістарычная. Ён паходзіў са старажытнага нямецкага рода і шмат гадоў правёў у Расіі, куды яшчэ ў юнацтве трапіў у якасці пажа пры герцагу Брауншвейгскім. Ён застаўся на вайсковай службе ў Расіі і ў 1750 годзе атрымаў званне ротмістра. Барон Мюнхаузен бываў у Польшчы і Літве. І іменна ў Літве, у шыкоўным маёнтку графа Пржабоўскага (прозвішча, хутчэй за ўсё, выдуманае), Мюнхаузен набыў цудоўнага каня. Ці мог ён пачуць гісторыю пра аленя з вішнёвым дрэвам на ілбе з вуснаў Пане Каханку? Тэарэтычна, мог. Дык каго можна назваць «каралём ілгуноў»: барона Мюнхаузена або Пане Каханку?

## Пан Твардоўскі

[1] Ад *cheir* — рука, *grapho* — пішу. Нешта рукапіснае: распіска, вексель, пісьмовы абавязак.

[2] Па чутках, пані Твардоўская здрадзіла свайму мужу, і за гэта ён зрабіў яе гаршэчнай гандляркай.

[3] Згодна з дамовай, Твардоўскі мог аддаваць загады нячыстай сіле сем гадоў, а потым трапляў у пекла.

## Папараць

[1] Галіцыя — гістарычная назва часткі заходне-ўкраінскіх і польскіх земляў (сучаснай Івана-Франкоўскай, Львоўскай, Цярнопальскай абласцей Украіны і Жэшувскай і часткі Кракаўскага ваяводства Польшчы).

[2] Цікава, што гэты варыянт варажбы потым прыводзілі ў сваіх творах Павел Шпілеўскі, Адам Багдановіч і іншыя фалькларысты і этнографы. Але, магчыма, адным з першых быў іменна Барычэўскі.

[3] У міфалогіі беларусаў папараць-кветка — міфічная кветка, дзякуючы якой чалавек, здабыўшы яе, набываў магчымасць разумець мову жывёл і раслін, яму адкрываліся месцы захаваных скарбаў і іншыя таямніцы. Але, звычайна, шчасця гэта не прыносіла... Як бачым, вобраз папараць-кветкі быў характэрны амаль для ўсёй славянскай міфалогіі.

## Смерць чарнакніжніка

[1] Мазовія — гістарычная вобласць Польшчы ў сярэдняй плыні ракі Віслы і ніжняй плыні Нарэва і Буга. Назва пайшла ад заходне-славянскага племя мазаўшан, якія ў IX—XI стагоддзях рассяліліся ў гэтых месцах і ўдзельнічалі ў этнагенезе польскай народнасці.

## Сож і Днепр

[1] Дзвіна, або Рыдван, — ад сярэднявечнай назвы Дзвіны — Эрыдан.

[2] У гэтых двух сказах Сож і Днепр пераблытаны месцамі. Вобраз Дняпра (Непра) займае вялікае месца ў беларускай і ўсходнеславянскай міфалогіі і фальклоры. Этымалогія звязана з агульнаіндаеўрапейскай назвай для азначэння вады.

[3] У гэтага падання несумнеўныя біблейскія карані (гісторыя пра тое, як Якаў падманам забраў правы першародства ў свайго брата Ісава).

## Стрэл

[1] Маларосія — з XVII стагоддзя назва Украіны ў афіцыйных актах царскай Расіі і ў рускай дваранскай і буржуазнай гісторыяграфіі.

## Улішыца

[1] Улішыца (магчымы варыянт — Вулішыца) належыць да культу Купалы, мае агульныя рысы з русалкай і сляды балцкага паходжання, звязанага з рэкамі (літоўскае *ohla*, *ohlis* — дробны камень, галька).

## Чорная кніга

[1] Толькі такое цудоўнае дрэва, як асіна, з яе дзіўнай здольнасцю паглынаць адмоўную энергію (адна яна змагла ўтрымаць цела Іуды, кол з яе забіваюць у сэрца вампірам і пярэваратням) змагла спаліць чорную кнігу.

[2] Выкажу здагадку, што лісты чорнай кнігі былі зробленыя з папірусу. Гэта расліна, з якой егіпцяне зрабілі першую паперу. Калі я быў у Егіпце, то падчас экскурсіі на папірусную фабрыку ў Луксоры нам паказалі старажытную тэхналогію вырабу паперы. Чым даўжэй разрэзаныя сцяблiны папірусу вымочваюць у вадзе, тым цямней атрымліваецца папера. І што дзіўна: досыць доўгі час гэтую паперу не бярэ агонь.

## Чортавы яблыкі

[1] Смала патрэбна чарцям, каб у пекле падсмажваць на ёй грэшнікаў.

## Беларускія павер'і

[1] Сведчанне таго, што раней беларусы хатніх птушак трымалі ў падпечку.

[2] Што тады думаць пчалярам, якіх за сезон джаляць сотні пчол?

[3] Выкарыстанне таўкача ў земляробчай магіі сведчыць аб разуменні гэтай прылады як фалічнага сімвала патэнцыі жыцця.

[4] Ахвяра асетніку (ёўніку) — сядзібнаму духу, які жыве ў асеці і рупіцца аб тым, каб правільна палілася сушыльная печ і сушыліся снапы і зерне.

[5] Ахвяра гуменніку — сядзібнаму духу ў выглядзе маленькага дабрадушнага дзядка, падпярэзанага саламяным перавяслам, які жыве ў гумне пад асеццю, ахоўвае гэтую забудову і дапамагае гаспадару малаціць збожжа.

# Працы І. П. Барычэўскага

Белорусские поговорки // Маяк. — СПб., 1845. — Т. XXIII, кн. XLVI (под псевд. В. Васильев).

Известия о древних памятниках, находящихся в ведомстве главного управления путей сообщения и публичных зданий // Известия императорского археологического общества, 1861. — Т. III.

Известия о трудах и жизни Ф. С. Шимкевича // Санкт-Петербургские ведомости, 1849. — № 128, 132.

Извлечение из сказаний Я. Рейтенфельса о состоянии России при царе Алексее Михайловиче // Журнал Министерства народного просвещения. — СПб., 1839. — Ч. XXIII.

Исследование о происхождении, названии и языке литовского народа // Журнал Министерства народного просвещения. — СПб., 1847. — № 12.

Камни литовских богинь // Журнал Министерства народного просвещения. — СПб., 1839. — Ч. XXII, отд. VII.

Мекленбургские древности // Журнал Министерства народного просвещения. — СПб., 1839. — Ч. XXIV.

Народные славянские рассказы, изданные И. Боричевским. — СПб., Типография Морского Корпуса, 1844.

Обзор «Губернских ведомостей» с 1842 по 1847 год // Журнал Министерства народного просвещения. — СПб., 1848—1855.

О русской летописи в Литве, называемой Хроникою Быховца // Журнал Министерства народного просвещения. — СПб., 1838. — Ч. XIX.

Отрывок из литовско-русской истории // Журнал Министерства народного просвещения. — СПб., 1845. — Ч. XLVIII.

Первое путешествие англичан в Россию в 1553 году // Журнал Министерства народного просвещения. — СПб., 1838. — Ч. XX.

Повести и предания народов славянского племени, изданные И. Боричевским. Часть I. — СПб., Типография Императорской Академии Наук, 1840. Часть II. — СПб., Типография Императорской Академии Наук, 1841.

Покутье в археологическом отношении. Исследование А. Г. Киркора (Pocutie pod wzgledem archeologicznym. Krakow, 1876). — СПб., 1876.

Православие и русская народносць в Литве. — СПб., 1851.

Предложения частных лиц об устройстве железных дорог, поступивших в главное управление путей сообщения и публичных зданий // Журнал главного управления путей сообщений, 1863. — Ч. XXXIX и XL.

Сведения о древних литовцах // Журнал Министерства народного просвещения. — СПб., 1844. — Ч. XLII, отд. II.

Сказания Адольфа Лизека о посольстве императора римского Леопольда к великому царю Московскому Алексею Михайловичу в 1675 году // Журнал Министерства народного просвещения. — СПб., 1837. — Ч. XVI.

Сказания польского историка Коборжицкого о походах Сигизмунда III и Владислава IV в Россию // Сын Отечества, 1842. — Т. II, III, V.

Славянщина. Рассказы : шутка за шутку. Еще шутка за шутку. И еще шутка за шутку. Улишица // Маяк, 1844. — Т. XVI, кн. XXXI, гл. V.

Славянщина. Рассказы : Неудачная покупка. Марко Кралевич и вила. Выстрел. Подбрехач // Маяк, 1844. Т. XVII, кн. XXXIII, гл. V.

## Змест




Ад перакладчыка ·3·

Бяздольны ·13·

Ваўкалака ·17·

Ваявода Канеўскі ·18·

Грымотная сіла ·22·

Дамова з нячысцікам ·23·

Дзіва дзіўнае ·25·

Жарт за жарт ·27·

Забой, Славой і Людэк ·30·

Круль Собек ·34·

Літоўскі вуж ·38·

Ліхая выдумка ·40·

Лятучы змей ·46·

Марка Кралевіч ·49·

Мужык не дурань ·52·

Павел Плецікоса ·54·

Падбрахач ·57·

Пане Каханку ·60·

Пан Твардоўскі ·64·

Папараць
•68•
Пярэварацень
•71•
Разбойнік
•72•
Распазнаванне ведзьмы
•75•
Смерць чарнакніжніка
•76•
Сож і Днепр
•78•
Стрэл
•80•
Улішыца
•83•
Чарадзей
•85•
Чарапаха
•89•
Чорная кніга
•90•
Чортава яма
•92•
Чортавы яблыкі
•97•
Беларускія павер'і
•98•
Каментарыі аўтара
•110•
Каментарыі перакладчыка
•117•
Працы І. П. Барычэўскага
•125•

Літаратурна-мастацкае выданне

**Барычэўскі** Іван Пятровіч

Народныя
славянскія
запаведы

Рэдактар *Л. У. Сідарава*
Мастацкае афармленне *А. І. Бужынскай*
Мастацкія рэдактары *А. І. Бужынская, В. Г. Загародні*
Тэхнічны рэдактар *Ж. М. Бароўская*
Карэктары *Л. К. Сямёнава, В. І. Смірнова*

16+ Падпісана да друку 27.10.2017. Фармат $60\times70^{1}/_{8}$.
Папера афсетная. Гарнітура «Trebuchet MS». Афсетны друк.
Ум. друк. арк. 12,48. Ул.-выд. арк. 8,1. Тыраж 800 экз. Зак.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларусь».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/4 ад 09.07.2013.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск, Рэспубліка Беларусь. http://belarusbook.by

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск, Рэспубліка Беларусь.